Источник: "Звязда" - 2024-05-15

# СІМВАЛЫ РОСКВІТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## Сацдаследаванне: большасць беларусаў лічаць дзяржсімволіку галоўным нацыянальным сімвалам краіны

**Сацыялагічнае даследаванне праведзена Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў ліпені-жніўні 2023 года. Апытанне праводзілася ва ўсіх абласных гарадах і Мінску, асобных раённых гарадах і сельскіх населеных пунктах. Аб'ём выбарачнай сукупнасці — 1863 рэспандэнты.**

Згодна з вынікамі даследавання, больш за дзве трэці насельніцтва нашай краіны (68,3 % усіх апытаных) галоўным нацыянальным сімвалам Беларусі лічаць дзяржаўную сімволіку — Дзяржаўны герб, Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны гімн. Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалай МЫСЛІВЕЦ**, дзяржаўныя сімвалы служаць сувязным звяном паміж дзяржавай і яе грамадзянамі, забяспечваюць пераемнасць пакаленняў і сацыяльную кансалідацыю ўсіх слаёў і груп грамадства, увасабляюць у сабе нацыянальную ідэю нашай дзяржавы. «Галоўныя сімвалы краіны аб'ядноўваюць нас у найважнейшыя і ўрачыстыя моманты — ад нацыянальных свят да спартыўных перамог, прыносячы кожнаму пачуццё гонару за тое, што мы — часціца нашай роднай Беларусі!» — падкрэсліў ён.

Па словах дырэктара Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, адной з найважнейшых умоў паспяховага вырашэння значных для Рэспублікі Беларусь задач з'яўляецца кансалідацыя грамадства. «На ўсіх этапах сваёй гісторыі беларускі народ гераічна бараніў родную зямлю, беражліва захоўваў сваю нацыянальную культуру і ўласны ўклад жыцця, думаў пра будучыню, — канстатаваў ён. — Актуальнасць умацавання адзінства нашага грамадства яшчэ больш узрастае ў сучасных умовах. Сацыяльная кансалідацыя — адзін з найважнейшых фактараў забеспячэння нацыянальнай бяспекі беларускай дзяржавы і грамадства. Кансалідацыі грамадства служаць шматлікія агульнапрынятыя сімвалы: у адзенні і ўпрыгожваннях, жыллёвых пабудовах і паўсядзённым жыцці. Беларусы шануюць і беражліва захоўваюць традыцыйныя народныя сімвалы, для ўсіх нас значныя і цікавыя аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, помнікі Вялікай Айчыннай вайны. Сучасным беларусам дарагія беларуская мова і літаратура, рэлігійныя святыні».

Мікалай Мыслівец падкрэсліў, што адным з найважнейшых атрыбутаў Рэспублікі Беларусь як суверэннай і незалежнай дзяржавы з'яўляюцца дзяржаўныя сімвалы: Дзяржаўны герб, Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны гімн. «З дапамогай простых і зразумелых сродкаў яны адлюстроўваюць гістарычныя і культурныя традыцыі беларускага народа, ідэнтычнасць і культурны код нацыі, менталітэт і духоўны патэнцыял грамадства», — акцэнтаваў увагу навуковец.

**Вераніка КАНЮТА.**